# Сцэнарый выхаваўчага мерапрыемства
# “А сёння ў нас Масленіца”

**Аўтары-распрацоўшчыкі:**
Д.А.Мардань, Г.С.Цярэня,
педагогі дадатковай адукацыі
ЦДАДзіМ “Маяк” г.Мінска

**Аб’яднанні па інтарэсах:** Фальклорныя ансамблі “Млынок”, “Жбанок”.

**Мэта:** азнаямленне навучэнцаў з народнай традыцыяй святкавання Масленіцы.

**Задачы:**

– азнаёміць навучэнцаў з песенямі і тнцамі народнага свята Масленіца;

– азнаёміць з народнымі традыцыямі і абрадамі, забавамі і гульнямі, прысвечанымі святкаванню Масленіцы;

– фарміраваць выканальніцкія навыкі сцэнічнай культуры.

**Метады навучання:**

– славесныя (тлумачэнне, аповяд);

– практычныя (заданні, практыкаванні, гульні);

– наглядныя (назіранне, дэманстрацыя навучэнцамі ансамбляў канцэртных нумароў).

**Абсталяванне:** калонкі, баян.

**Рэквізіт:** пудзіла, бліны, рушнік, кола са стужкамі і інш.

## ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

## <u>ПЕРШАЯ ЧАСТКА. УСТУП</u>

***<u>Песня “У нас сягоння масленка-масленка”</u>***

**Вядучая Даша**: Добры дзень, паважаныя сябры!

**Вядучая Глафіра**: Падыходзьце бліжэй да нас, запрашаем у госці вас! А ці ведаеце, што сёння ў нас за свята? Калі не, так слухайце. Зараз мы пазнаёмім вас з традыцыйным народным святам – Масленіца, якое мы хутка будзем святкаваць. Ці чулі вы пра яго?

**Вядучая Даша:** Масленіца – гэта апошняе зімовае свята народнага календара. Сустрэча зімы з вясною. Свята чакалі з вялікай нецярплівасцю, бо гэты тыдзень быў напоўнены святочнымі дзеяннямі, частаваннямі, гульнямі і забавамі. Усе хацелі, каб хутчэй прыйшла цёплая пара, і сваімі дзеяннямі нібыта выганялі зіму.

**Вядучая Глафіра**: На Масленіцу звычайна елі сыр, масла, малако і, канешне, бліны. Бліны былі як сімвал сонца, таму што яны сапраўды нагадваюць сонца. Елі іх з маслам, мёдам ці смятанай. Кожны дзень тыдня меў сваю назву і сваё прызначэнне.

**Вядучая Даша:** Панядзелак – сустрэча. У гэты дзень пяклі бліны, майстравалі санкі і коўзанкі для катання з горак, рабілі і пудзіла Масленіцы. Аўторак – дарослыя каталіся з высокіх ледзяных гор разам з дзецьмі, пачыналі хадзіць у госці адзін да аднаго.

**Вядучая Глафіра:** Серада – зяці хадзілі ў госці да цешчы на бліны. Калі зяць не прыязджаў у госці, то гэта лічылася вялікай крыўдай і непавагай з яго боку да жонкі.

Чацвер – Тлусны ці Крывы. Пяклі бліны і аладкі, у тым ліку і для жывёлы, каб яны былі гладкімі і тлуснымі.

Пятніца – Цешчыны вечары. Гулянні працягваліся, вяскоўцы наведвалі сваіх родзічаў. Хлопцаў, якія не паспелі ажаніцца да Масленіцы, "каралі": прывязвалі да іх калодкі, каб хлопцы цягалі за сабой. Калі яны гэтага рабіць не хацелі, то павінны былі багата адкупіцца – блінамі, сырам, цукеркамі.

**Вядучая Даша**: Асабліва вясёлымі былі субота і нядзеля. У суботу моладзь весялілася: хлопцыі дзяўчаты гушкаліся на арэлях, упрыгожвалі стужкамі, кветкамі, званочкамі коней, воз ці сані і каталіся па вёсцы.

Нядзеля – Прашчоная. У гэты дзень спальвалі пудзіла, якое сімвалізавала зіму. Вакол вогнішча вадзілі карагоды, спявалі песні. А яшчэ ў гэты дзень людзі адзін у аднаго прасілі прабачэння, спачатку малодшыя, потым старэйшыя: "Прабач, калі чым саграшыў перад табою справаю ці языком".

**Вядучая Глафіра**: А зараз, мы з вамі пачнем наше знаёмства з маслянічнымі песнямі, забавамі і гульнямі. Пачнём з вамі вясну сустракаці і зіму адпраўляці.

**Вядучая Даша**: Вітаем усіх, хто да нас прыйшоў. На наша свята гадзіну знайшоў.

## ДРУГАЯ ЧАСТКА

*Пад найгрыш выходзяць удзельнікі гуртоў, нясуць пудзіла і гавораць словы:*

– Гаспадары, дзверы адчыняйце!
Масленіцу сустракайце!
– Добрага дня вам, паважаныя!
Благаславі, Божа, на ўзгорачак стаці,
Масленіцу прывітаці.
– Масленіцу прывітаці, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну адмыкаці.

### ***Песня "А ў нас сяння масленка, масленка"***

**Вядучая Глафіра:** Масленка, Масленка, бывай зіма красненька! Пачастуй блінамі, напаі малаком! Як белы сняжок – дай сыру кусок!

### ***Песня "Сядзелі дзеўкі на досцы"***

**Вядучая Даша**: Наша Масленка гадавая, яна госцейка дарагая! Першая да нас не ходзіць – усё на коніках раз'язджае, каб конікі былі вараныя, каб слугі былі маладыя.

**Вядучая Глафіра**: Хто з гары пракоціцца, той яшчэ вароціцца! Масленка катліва – пакатацца міла! А ты не зявай, зімовыя загадкі адгадай!

***<u>Загадкі удзельнікам гуртоў</u>***

**1 вучань**: Улетку адпачываюць, а ўзімку дзяцей катаюць. *(Санкі).*

**2 вучань**: Па сцяжыне, па дарозе бегчы я ў іх не змозе. І па снезе не ідуць, лёд убачаць – і лятуць! *(Канькі).*

**3 вучань**: Шар пастаўлены на шар, нос чырвоны на ўвесь твар, рот і вочы – вугалькі. Адгадайце, хто такі. *(Снегавік).*

**4 вучань**: Без рук малюе, без зубоў кусае. *(Мароз).*

**5 вучань**: З неба ўпаў, усю зямлю, як абрусам, заслаў. *(Снег).*

**6 вучань**: Зараз будзем строіць смешкі – запрашаем на пацешкі!

**Вядучая Глафіра:** Танцы й карагоды не выходзяць з моды! Хай гучаць песні ў нас на прадвесні! Гэй, народ, станавіся ў карагод!

***<u>Песня “Ідзі зіма із-пад печы”</u>***

*Усе становяцца ў карагод і пачынаюць хадзіць вакол пудзіла пад песню.*

**Вядучая Даша:** А зараз мы разам праспяваем рэфрэн песні ***“Масленая, шчаслівая працягніся да Вяліка дня”***

***<u>Песня “Ой казалі масленай сем нядзель”</u>***

**Вядучая Глафіра:** На Масленіцу гулялі таксама ў розныя гульні, ладзілі танцы. Прапаную разам пагуляць у гульні **Цяцерка і Юрачка.**

**Вядучая Даша**: А зараз паспрабуем патанчыць з вамі **“Ой-ру і Лявоніху”.**

**Разам**: Масленка, Масленка, бывай зіма красненька! А мы, госцейкі, развітаемся, на новыя сустрэчы спадзяваемся!